# ЗАДАННІ ПА РАЗВІЦЦІ ЗВЯЗНАЙ МОВЫ Ў ПАДРУЧНІКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ДЛЯ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

Чарніцкая Наталля Ігараўна
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт

У тлумачальнай запісцы праграмы па беларускай мове для пачатковай школы падкрэсліваецца, што «развіццё мовы з’яўляецца адным з галоўных напрамкаў працы ў пачатковых класах. Практычная накіраванасць моўнай адукацыі дазваляе вучням засвойваць функцыянальныя ўласцівасці моўных адзінак» [1, с. 158].

Толькі сістэма заданняў і спецыяльных практыкаванняў у сучасных падручніках па беларускай мове, якія будуць садзейнічаць развіццю ўсіх відаў маўленчай дзейнасці школьніка, а таксама ўменне свабодна карыстацца роднай мовай у розных сітуацыях зносін, дазволіць настаўніку рэалізаваць на практыцы праграмныя патрабаванні.

Праведзены аналіз падручніка па беларускай мове для 3 класа агульнаадукацыйных устаноў з рускай мовай навучання (Т. М. Валынец, І. Э. Ратнікава, І. С. Роўда, П. П. Шуба) [2–3] пераконвае ў дастатковай напоўненасці практыкаванняў прыёмамі па развіцці звязнай мовы вучняў. Падручнік строга адпавядае праграме, у ім рэалізуюцца элементы развіцёвага навучання, прапанаваны заданні павышанай цяжкасці.

Як адзначаецца ў праграме, у трэцім класе на аснове працы з тэкстам (маўленчым выказваннем) у вучняў павінны быць сфарміраваны наступныя камунікатыўна-маўленчыя ўменні і навыкі: «вызначаць асноўную сюжэтную лінію ў тэксце празаічным, вершаваным, бачыць адрозненні вершаванага тэксту ад празаічнага; разумець і адчуваць рытмічнае маўленне, рыфмаванае; складаць тэкст (празаічны і вершаваны) па дадзеным загалоўку; складаць тэкст па пачатку і заключэнні; хутка і доказна вызначаць месца, час дзеяння, дзючых асоб; вызначаць тэму, падтэмы, галоўную думку тэксту, маўленчага выказвання; разумець істотны змест інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў тэксце; складаць тэкст на тэму; вызначаць ключавыя словы, ключавыя сказы, ключавыя абзацы; складаць план тэксту і тэкст па плане; пераказ тэксту (падрабязны, сціслы, выбарачны, творчы); пабудова дыялогу, маналогу; вызначаць на слых незразумелыя па значэнні словы, тлумачыць іх значэнні; бачыць вобразныя словы, моўныя сродкі вобразнага выражэння» [1, с. 96 ].

З 412 практыкаванняў дзвюх частак падручніка ва ўмовах да 179 змешчаны заданні па развіцці звязнай мовы. Гэта складае 43,4% ад агульнай колькасці практыкаванняў.

Заданні ў такіх практыкаваннях звязаны з работай над тэкстам – гатовым ці стварaемым. У залежнасці ад гэтага можна вылучыць пяць груп практыкаванняў, накіраваных на развіццё звязнай мовы вучняў, прыклады якіх знаходзім у падручніку «Беларуская мова» для 3 класа:

1. Практыкаванні аналітычнага характару па гатовым тэксце, напрыклад: практыкаванне 67 (ч. 1 с. 36): Прачытайце тэкст. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту; практыкаванне 70 (ч. 1, с. 37): Прачытайце. Вызначце, пра што гаворыцца ў тэксце і інш.Падобнага тыпу практыкаванні садзейнічаюць выпрацоўцы навыкаў аналізу тэксту.

2. Практыкаванні аналітыка-моўнага характару па гатовым тэксце, якія накіраваны на ўзнаўленне асобных элементаў тэксту, напрыклад: практыкаванне 72 (ч. 1, с. 39): Прачытайце тэкст. Аўтар даў тэксту загаловак «Вясёлкі над зямлёю». Ці можна даць іншы загаловак? Які з гэтых загалоўкаў будзе адпавядаць тэме, а які – асноўнай думцы тэксту?; практыкаванне 25 (ч. 1, с. 14): Прачытайце. Пра якое «люстраное акно» апавядае аўтар? і інш.

Такога тыпу практыкаванні прадугледжваюць выпрацоўку навыкаў аналізу, абстрагавання, абагульнення, выкарыстання пэўных моўных дзеянняў.

3. Практыкаванні на перапрацоўку гатовага тэксту, напрыклад: практыкаванне 137 (ч. 1, с. 78): З дапамогай спецыяльных слоў і інтанацыі вусна ператварыце сказы ў клічныя; практыкаванне 79 (ч. 1, с. 43): Прачытайце тэкст. Вызначце ў ім пачатак, асноўную частку і канцоўку. Запішыце тэкст правільна і інш.

Такія практыкаванні патрабуюць навыкаў выпраўлення тэксту, стварэння ўдасканаленых, новых ці абноўленых (перапрацаваных) частак тэксту шляхам увядзення ў тэкст цытат, якія пацвярждаюць выказаныя аўтарам меркаванні.

4. Практыкаванні з заданнямі на стварэнне новага тэксту на аснове дадзенага, напрыклад: практыкаванне 26 (ч. 1, с. 16): Прачытайце, змяняючы назоўнікі так, як гэтага патрабуюць іншыя словы сказа; практыкаванне 232 (ч. 1, с. 129): Ад прапанаваных слоў утварыце і запішыце новыя пры дапамозе суфікса -ок і інш.

5. Практыкаванні з заданнямі, арыентаванымі на стварэнне вучнямі свайго тэксту, напрыклад: практыкаванне 113 (ч. 2, с. 62): Разгледзьце малюнак. Расскажыце, што вы бачыце на ім; практыкаванне 223 (ч. 1, с. 124): Прыдумайце і запішыце сказы, у якіх былі б словы з прыназоўнікамі і прыстаўкамі па-, за-, з-, у- ; практыкаванне 227 (ч. 1, с. 126): Разгледзьце малюнкі. Што вы на іх бачыце? Якім словам абазначаны большы прадмет? і інш. Значная ўвага ў заданнях да практыкаванняў гэтай групы адводзіцца розным відам пераказаў і сачыненняў – традыцыйным відам пісьмовых і вусных выказванняў.

Такім чынам, у змест школьных падручнікаў аўтары ўключаюць практыкаванні з заданнямі па развіцці звязнай мовы. Аднак для таго, каб развіццё звязнай мовы малодшых школьнікаў было featureразнабаковым, настаўніку, улічваючы характар і асаблівасці вывучаемага матэрыялу, неабходна ўводзіць у адукацыйны працэс дадаткова заданні творчага

характару, якія будуць садзейнічаць актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання. I–IV класы. – Мінск, 2007. – 376 с.
2. Беларуская мова : падруч. для 3-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / Т. М. Валынец [і інш.]. – Мінск, 2012. – 120 с.
3. Беларуская мова : падруч. для 3-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / Т. М. Валынец [і інш.]. – Мінск, 2012. – 120 с.